Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 45 (114)
СУБОТА
24
ЛЮТАГА
1940 г.

Цана 10 капеек

ЗАГАД ВОЙСКАМ БЕЛАРУСКАЙ АСОБАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

Горад Мінск *№ 10* *23 лютага 1940 года*

Таварышы чырвонаармейцы, камандзіры, камісары і палітработнікі!

Сёння, 23 лютага 1940 года, Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот разам з усім нашым совецкім народам святкуюць XXII гадавіну свайго слаўнага існавання. Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот з'яўляюцца дзецішчам партыі Леніна — Сталіна.

Увесь шлях арганізацыі, росту і ўмацавання Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота звязан з іменем бяссмертнага Леніна, з іменем нашага правадыра, друга і настаўніка, вялікага Сталіна. У годы вялікіх боек грамадзянскай вайны, кіруемая і натхняемая большэвіцкай партыяй, вялікім Сталіным і яго лепшым баявым саратнікам, буйнейшым пролетарскім палкаводцам Клімам Варашылавым, Чырвоная Армія пакрыла сябе неўвядаемай славай, упісала яркія гераічныя старонкі ў сваю гісторыю, у гісторыю ўсяго совецкага народа. Следуючы баявым традыцыям грамадзянскай вайны, Чырвоная Армія, багата аснашчоная і ўзброеная першакласнай тэхнікай, з яе выдатнымі сталінскімі кадрамі байцоў, камандзіраў, камісараў і палітработнікаў, у слаўныя баявыя дні ля возера Хасан, на граніцы МНР і ў гераічным вызваленчым паходзе супроць польскіх паноў і капіталістаў яшчэ раз перад усім светам праславіла сілу, несакрушальную магутнасць совецкай зброі. Мужнасць, гераізм, доблесць, адвагу і баявую вывучку Чырвоная Армія ярка паказвае зараз у баях супроць фінскай белагвардзейшчыны, узбагачаючы сваю гісторыю новымі подвігамі і бяссмертнай славай. Наша Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот былі, ёсць і будуць гразой для ворагаў нашай радзімы, гордасцю і славай краіны соцыялізма.

Слаўная XXII гадавіна супадае з гадавінай прыняцця ўсім асабовым саставам Чырвонай Арміі Ваеннай прысягі на вернасць сваёй Радзіме, Совецкаму Ураду, партыі Леніна—Сталіна.

Таварышы чырвонаармейцы, камандзіры, камісары і палітработнікі! Свята захоўвайце свяшчэнныя словы вялікай клятвы—Ваеннай прысягі і з годнасцю воіна краіны соцыялізма ператварайце яе ў жыццё. З чэсцю захоўвайце і ўмацоўвайце баявыя традыцыі Чырвонай Арміі, слаўных і адважных яе герояў, аддаўшых жыццё за справу комунізма. Упарта працуйце над сабой, дабівайцеся новых поспехаў у баявой і палітычнай падрыхтоўцы. Будзьце пільны і ў дасканаласці, «на выдатна» авалодвайце баявой зброяй, якую ўручыў нам вялікі совецкі народ. Авалодвайце рэволюцыйнай тэорыяй Маркса—Энгельса — Леніна — Сталіна— самай магутнай і непераможнай ідэйнай зброяй.

У гістарычныя дні святкавання XXII гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота яшчэ раз запэўнім нашу партыю, урад і вялікага Сталіна, што мы заўсёды гатовы знішчыць любога ворага і з любога лагера імперыялістычных драпежнікаў, які паспрабуе пасягнуць на нашу цудоўную соцыялістычную Радзіму.

Віншую Вас з вялікім святам XXII гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота!

Няхай жыве Ўсесаюзная Комуністычная Партыя (большэвікоў)—арганізатар нашых перамог!

Няхай жыве непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот!

Няхай жыве арганізатар і натхніцель перамог Чырвонай Арміі, вялікі стваральнік магутнасці нашай Радзімы, наш бацька, друг і настаўнік, наш мудры Сталін!

Намеснік камандуючага БАВА камкор
КУЗНЕЦОЎ

Член Ваеннага Совета БАВА дывізіённы камісар
СМАКАЧОЎ

Намеснік начальніка штаба БАВА камбрыг
БУРЭНІН.

—«о»—

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 22 лютага на фронце не адбылося нічога істотнага. На Карэльскім перашэйку нашы часці, адкідаючы праціўніка, занялі 21 абарончы ўмацаваны пункт, з іх 15 жалезабетонных артылерыйскіх збудаванняў.

З прычыны сільнай снежнай мяцеліцы дзеянні авіяцыі абмежаваліся разведчымі палётамі.

ЭСТОНСКАЯ ГАЗЕТА АБ ПОСПЕХАХ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Талін, 23 лютага. (ТАСС) Газета «Рахвалехт», паведамляючы аб прарыве Чырвонай Арміяй лініі Манергейма, піша: «На карэльскім перашэйку Чырвоная Армія атакавала сучасную лінію умацаванняў і заняла яе. Для войск, якія да гэтага часу сядзяць у бяздзейнічанні за лініямі Мажыно і Зігфрыда, гэтыя бai ў Фінляндыі вельмі павучальны. Бai на лініі Манергейма паказалі смеласць байцоў Чырвонай Арміі і добрае тэхнічнае ўзбраенне совецкіх войск.»

РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

ПАСТАНОВА
АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ МІХАЙЛАЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 349

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Максімлюк Еўдакіі Фёдараўны

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» зарэгістраваць для балатыроўкі па Міхайлаўскай выбарчай акрузе № 349 вылучаную агульным сходам рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў камбіната № 9 і сходам сялян Міхайлаўскага сельсовета, на якіх прысутнічала 700 чалавек, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 453 чалавекі, — кандыдатуру тав. Максімлюк Еўдакіі Фёдараўны, 1901 года нараджэння, сялянку, беспартыйную, пражываючую ў вёсцы Нова-Воля, Міхайлаўскага сельсовета, Заблудаўскага раёна.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» уключыць кандыдатуру тав. Максімлюк Е. Ф. ў выбарчы бюлетэнь па Міхайлаўскай выбарчай акрузе № 349.

У адпаведнасці з арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» пастанову надрукаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі **ШКАТУЛА,**
Намеснік старшыні **ТОЛКАЧ,**
Сакратар камісіі **МАЗГАВОЙ,**
Члены:
ГУТНІК, ДАРОШКА, АСТРАВЕЦКАЯ, ОЗЯБЛО, ТРУСЕВІЧ, СМАКТУНОВІЧ.

Вёска Міхайлава, 22 лютага 1940 г.

ПАСТАНОВА
АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЕДВАБНАЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 331

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Камароўскай Веры Александраўны

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» зарэгістраваць для балатыроўкі па Едвабнаўскай выбарчай акрузе № 331 вылучаную агульным сходам сялян вёскі Пенькі-Баравое, Касакоўскага сельсовета, Едвабнаўскага раёна, на якім прысутнічала 70 чалавек; і сходам сялян рабочых і служачых гарадскога пасялковага совета Едвабна, на якім прысутнічала 583 чалавекі, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 121 чалавек, кандыдатуру тав. Камароўскай Веры Александраўны, 1900 года нараджэння, беспартыйнай, сялянкі, пражываючай у вёсцы Пенькі-Баравое, Касакоўскага сельсовета, Едвабнаўскага раёна.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», уключыць кандыдатуру тав. Камароўскай В. А. ў выбарчы бюлетэнь па Едвабнаўскай выбарчай акрузе № 331.

У адпаведнасці з арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», пастанову надрукаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі **УСЦІЛОЎСКІ,**
Намеснік старшыні **КАЗАКЕВІЧ.**
Сакратар камісіі **ІСАКАЎ,**
Члены:
КАЛІНОЎСКІ, ЧАПНІЦКАЯ, НОРМАН.

21 лютага 1940 г.
пасёлак Едвабны.

ПАСТАНОВА
АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ МОНЬКАЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 361

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Чэрнікава Александра Нікіфаравіча

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» зарэгістраваць для балатыроўкі па Монькаўскай выбарчай акрузе № 361 вылучаную агульным сходам рабочых скурзавода № 15 у м. Яхіноўка, на якім прысутнічала 92 чалавекі; сходам сялян вёскі Каліноўка, Монькаўскага раёна, на якім прысутнічала 340 чалавек; падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 92 чалавекі, кандыдатуру Чэрнікава Александра Нікіфаравіча, 1889 года нараджэння, з сялян, члена ВКП(б), камандзіра РСЧА, пражываючага ў г. Беластоку.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» уключыць кандыдатуру тав. Чэрнікава А. Н. у выбарчы бюлетэнь па Монькаўскай выбарчай акрузе № 361.

У адпаведнасці з арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» пастанову надрукаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі **САНЬКОВІЧ**
Сакратар камісіі **НІКЕЛЬ,**
Члены:
АХРЭМЧЫК, АЛЕЙНІКАЎ, ШЧЭГЛОВА, КАЗЛОЎСКІ, БЛЯШКО.

пас. Монькі, 23 лютага 1940 г.

ПАСТАНОВА
АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 351

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Іванова Нікалая Сцяпанавіча

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» зарэгістраваць для балатыроўкі па Чырвонаармейскай выбарчай акрузе № 351 вылучаную агульнымі сходамі рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых дрота-гваздзільнага завода № 1, механічнага завода № 35 і дзяржаўнага піваварнага завода, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 180 чалавек, кандыдатуру тав. Іванова Нікалая Сцяпанавіча, 1887 года нараджэння, рабочага-слесара, беспартыйнага, пражываючага ў г. Беластоку.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» уключыць кандыдатуру тав. Іванова Н. С. у выбарчы бюлетэнь па Чырвонаармейскай выбарчай акрузе № 351.

У адпаведнасці з арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» пастанову надрукаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі **САМОЙЛІЧ,**
Нам. старшыні **СЛІСКІ,**
Члены:
КУКЛІНСКІ, ІВАНОЎСКАЯ, САКОЛЬСКІ, ЗУБРЫЦКАЯ.

г. Беласток, 23 лютага 1940 г.

ПАСТАНОВА
АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЛАПСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 346

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Банась-Банасюка Адольфа Станіслававіча

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» зарэгістраваць для балатыроўкі па Лапскай выбарчай акрузе № 346 вылучаную агульным сходам паравоза-вагона рамонтнага завода ст. Лапы, на якім прысутнічала 1500 чалавек, і сходамі сялян вёсак Данілава, Енькі і Лупянка і падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 400 чалавек, кандыдатуру тав. Банась-Банасюка Адольфа Станіслававіча, 1889 года нараджэння, беспартыйнага, старшыню Алексінскага сельсовета, пражываючага ў вёсцы Данілава, Алексінскага сельсовета.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» уключыць кандыдатуру т. Банась-Банасюка А. С. ў выбарчы бюлетэнь па Лапскай выбарчай акрузе № 346.

У адпаведнасці з арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» пастанову надрукаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі **ОРШАНСКІ,**
Намеснік старшыні **РАГОЎСКІ,**
Сакратар камісіі **САФЕЙЧЭНКА,**
Члены:
ПРЫХОДЗЬКА, КАНОПКА, ДЗЕНІШЭЎСКІ.

Гор. Лапы, 21 лютага 1940 г.

24 САКАВІКА ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР І БССР

ВЫБАРШЧЫКІ 582 ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ, УСЕ, ЯК АДЗІН, АДДАВАЙЦЕ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА КАНДЫДАТА БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ, ЗА ВЕРНАГА СЫНА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА, СЯРГЕЯ ОСІПАВІЧА ПРЫТЫЦКАГА!

СЯРГЕЙ ОСІПАВІЧ ПРЫТЫЦКІ

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Хлопчыкам Сяргей Прытыцкі пасвіў кароў у кулака. Хутар, на якім жыў Сяргей, знаходзіўся далека ад роднай вёскі. Пасвіць жывелу прыходзілася аднаму на ўзлеску. Было адзінокаму пастушку маркотна і сумна. Ляжа пастушок на траву, заглядзіцца на нябесную сінь, ды і засне. Гаспадар, награнуўшы ў такія мінуты, узнімаў яго ўдарам бізуна . . .

Сяргею было толькі 12 год. Каб не заснуць, ён стаў спяваць песні, раздумваць аб розных рэчах. Ляжаў, бывала, глядзеў на воблакі і пытаў сябе: хто, напрыклад, вывешвае чырвоны сцяг на крыжы за вёскай у дні 1-га мая і 7-га лістапада. Гонiць, бывала, Сяргей кароў, заўважыць чырвоны сцяг, ці плакат на прыдарожным крыжы і думае: гэта, гавораць, комуністы вывешваюць. Эх! Калі-б убачыць жывога комуніста...

Ад старэйшых Сяргей давядаўся, што комуністы—асаблівы народ. Яны не баяцца ні паноў, ні паліцыянтаў. Яны сядзяць у турмах, іх вешаюць і расстрэльваюць, іх б'юць гумавымі палкамі, а яны ўсё-такі робяць сваю справу.

У тыя годы Сяргей прадстаўляў сабе комуністаў высокімі, моцнымі, смелымі, з тварам суровым і строгім.

Старэйшы брат Александр прыносіў часам дамоў падпольную літаратуру. Даваў чытаць Сяргею піонерскія кніжкі—на беларускай і рускай мовах. Схаваўшы кніжкі за пазуху, хлопчык уносіў іх з сабой на пасьбішча. Ляжаў там на лугу, чытаў тайком, пазнаваў, як жывуць дзеці Совецкага Саюза.. Ляжыць, ляжыць ды і расплачацца раптам ад зайздрасці.

У той час выспела ў Сяргея думка бегчы ў Совецкі Саюз. Рашыў бегчы разам з адным сваім сябрам Іванам Касцецкім. Дасталі нават крыху грошай. Але калі Сяргей прышоў аднойчы вечарам к Івану, каб разам ісці да граніцы,—таварыш струсіў. Адзін Сяргей таксама пабаяўся ісці.

Як і ўсе сялянскія падросткі, Сяргей ненавідзеў паліцыянтаў. Для беларускіх сялян галоўным прадстаўніком акупантаў быў паліцыянт. За кожнае глупства ён збіваў сялян, арыштоўваў. Калі паліцыянт праходзіў па вуліцы, Сяргею заўсёды хацелася кінуць у яго камень.

Вучыўся Сяргей у польскай школе, якая была ў суседняй вёсцы. Настаўнік Кржыжаноўскі расказваў вучням аб польскіх каралях. Сяргей зненавідзеў гэтых каралёў. Аднойчы яго пакінулі без абеда, і пакараны школьнік парваў вісеўшыя ў класах партрэты Пілсудскага і Масціцкага. Калі Сяргей не прышоў у школу 1 мая—настаўнік ударыў яго па твары, а затым высек. Гэты польскі «выхавацель» Кржыжаноўскі меў доўгі конскі твар, маленькія, рыскаўшыя ва ўсе бакі вочкі. Пазней, калі Сяргей сустракаў шпікаў, ён заўсёды ўспамінаў гэтую фізіяномію.

Пасля школы Сяргей працаваў батраком і разам з бацькам пільшчыкам.

Аднойчы ў 1931 годзе да падростка Прытыцкага падышлі маладыя хлопцы аднавяскоўцы і звярнуліся з просьбай:

— Сяргейка, у нас павінен быць адзін сход, пайсці няма каму. Сходзі ў мястэчка Крынка, не пашкадуеш.

Сяргея пасвяцілі ў сутнасць справы, паведамілі пароль, растлумачылі правілы канспірацыі і адправілі. Цёмнай ноччу ў балоце, у адзінокай хаціне адбылася раённая комсамольская канферэнцыя. Тут упершыню ўбачыў Сяргей жывога комуніста.

Канферэнцыя працягвалася ўсю ноч і была прысвечана падрыхтоўцы да першамайскай дэманстрацыі.

З гэтага дня пачалася актыўная рэволюцыйная дзейнасць выдатнага сына беларускага народа Сяргея Прытыцкага. Ён прысвяціў сябе ўсяго падпольнай рабоце. На сялянскіх могілках, у лесе, а зімой у якой-небудзь хаціне, падвале, завесіўшы вокны і выставіўшы дзяжурных, праводзіў сходы комсамольцаў Заходняй Беларусі Сяргей Прытыцкі. Працаваць было не толькі небяспечна, але і цяжка. Сяргей стаў непазнаваемы. На якой-небудзь вечарынцы ён спяваў песні, весяліўся з хлопцамі, але галава яго была занята зусім іншым. Бывала працуе Сяргей на полі, спыніцца, задумаецца і не ведае, колькі прастаяў на месцы...

Не было з кім параіцца, адзінае кіраўніцтва—кнігі, літаратура. Вельмі многа чытаў.

У 1932 годзе Сяргея Прытыцкага выбіраюць ужо членам гродненскага падпольнага камітэта комсамола. Ён сустракаецца з радам выдатных неўстрашымых змагароў - падпольшчыкаў, ён вучыцца ў іх. Хаваючыся ад паліцыі і дэфензівы, ён вандруе з вёскі ў вёску, з раёна ў раён. У маі 1933 года дэфензіва хапае Сяргея ў мястэчку Азёры. На працягу трох сутак пыталі яго ў гродненскай дэфензіве. Шэф дэфензівы Скірмунд асабіста збіваў яго і мучыў. Але Сяргей нічога не сказаў, не выдаў ні сябе, ні арганізацыю.

Яго вымушаны былі вызваліць.

Далей ідуць дні глухога падполля. Паліцыя выстаўляла засады на дарогах, прыходзілася па два, па тры дні хавацца ў лесе. З вёскі ў вёску Сяргей перабіраўся толькі ноччу. Ідзе, прыслухоўваючыся да кожнага шораху.

Наступае новы перыяд, у жыцці Сяргея — ён кіруе падпольнай арганізацыяй Слонімшчыны. Тут разгараецца ўсеагульная стачка лесарубаў і возчыкаў. Сяргей кіруе гэтай стачкай. Паліцыя ганяецца за ім, але ён заўсёды ўходзіць ад яе, часам адстрэльваючыся. Тут прышлося яму не раз адсіджвацца ў ярах, у халодную асеннюю пару без гарачай ежы. Але сяляне працягвалі атрымліваць ад Сяргея ўказанні, і стачка працягвалася.

10 цяжкіх год — самых лепшых год чалавечага жыцця — аддаў Сяргей гэтай барацьбе.

* * *

27 студзеня 1936 года. У гор. Вільна ў акруговым судзе адбываецца чарговы працэс над комуністамі. Ужо дапытаны ўсе сведкі, за выключэннем галоўнага, вядомага правакатара Стрэльчука.

— Выклічце сведку Стрэльчука,—аб'яўляе старшынствуючы.

Усе погляды прысутных на судзе звернуты на дзверы пакоя сведак, але... Стрэльчук паяўляецца ў зале з пракурорскага кабінета.

Поўны, 30-гадовы бландын, сярэдняга росту, апрануты ў выдатны шэры касцюм. Ён ідзе цвёрдым, рашучым крокам, аднак яго галава апушчана ўніз. Правакатар не можа глядзець на людзей, якіх ён прадае. У зале пануе напружаная цішыня. Ціхім, хрыплым голасам пачынае Стрэльчук свае словы Іуды.

Якуб Стрэльчук — сын буйнага кулака з Бельскага павета, вучыўся ў польскай школе, служыў у былой польскай арміі, дзе атрымаў чын малодшага афіцэра. У роднае беларускае сяло ён вярнуўся кіраўніком маладзёжнай буржуазнай арганізацыі «Стралец». Комуністы і комсамольцы, якія працавалі ў падполлі, перацягнулі яго на свой бок. Прымусілі распусціць стральцоў, уцягнулі ў падпольную работу. Працаваў Стрэльчук у падпольнай арганізацыі комсамола смела і актыўна. Гэтым ён адразу заваяваў аўтарытэт у комсамольцаў. Яго ўсюды выбіралі: у пачатку сакратаром аднаго з акружкомаў комсамола,



потым Стрэльчук узначальваў комсамольскую арганізацыю Слоніма, Беластока, Брэста, Баранавіч..

У комсамольскай арганізацыі пачаліся масавыя арышты актыва. Арыштоўваліся кіраўнікі партыйных арганізацый адзін за другім.

— Гэта справа рук правакатара, — рашылі ўсе.. Пачалі сачыць. Усе ніці вялі да Стрэльчука. У сакавіку 1935 года Стрэльчук канчаткова быў выкрыты, як правакатар. Яго хацелі чыста і гладка «убраць». Але Стрэльчук не даўся. Ён адкрыта перайшоў на службу дэфензівы і, ахоўваемы атрадамі жандармаў і шпікаў, ездзіў па раёнах Заходняй Беларусі і выдаваў паліцыі адну арганізацыю за другой. Ён выступаў на судах у якасці сведкі абвінавачання, ён прадаваў усіх і ўсё. Ён паслаў на шыбеніцу і катаргу да тысячы чалавек.

У дэфензіве не раз Стрэльчук сам, закасаўшы рукавы, збіваў арыштаваных.

Правакатара трэба было знішчыць. Так рашылі застаўшыеся комсамольскія арганізацыі, але выканаць гэта рашэнне нікому не ўдавалася. Стрэльчук хаваўся ў логавах дэфензівы і паказваўся толькі ў судзе.

Выканаць прыгавор над здраднікам узяўся Сяргей Прытыцкі. У жыцці Прытыцкі ніколі не сустракаўся з Стрэльчуком. Яны не ведалі адзін другога ў твар. Гэта аблягчала Прытыцкаму прысутнасць у зале суда, але гэта і затрудняла яму выкананне прыгавора, так як Прытыцкі не бачыў нават фатаграфіі чалавека, у якога павінен страляць.

Ён прыступіў да выкання задачы. Яму далі браўнінг. Прытыцкі праверыў яго, браўнінг аказаўся ненадзейным. Ён узяў яшчэ адзін браўнінг. Так з двума рэвальверамі прышоў Сяргей Прытыцкі 27 студзеня 1936 года к 9 гадзінам раніцы ў Віленскі акруговы суд, дзе правакатар Стрэльчук рыхтаваўся прадаць новую групу падпольшчыкаў.

— Калі я ішоў у суд, я ведаў, што гэта на 99 процантаў для мяне смерць. Але раз патрэбна—значыцца трэба ісці,— расказвае Прытыцкі.

Большасць з падсудных ведалі Прытыцкага асабіста. Яго не бачылі каля двух год. І вось цяпер сустрэча ў судзе. Дзесятак пар вачэй з лавы падсудных быў звернут на маладога чалавека ў цёмным касцюме. Шпікі, якія сачылі за поглядамі падсудных, пачалі рыскаць па залу — каго яны там убачылі з сваіх. Патрэбна была велізарная сіла волі, каб спакойна, нічым не выдаючы сябе, прасядзець у такіх умовах з 9 гадзін раніцы да 3 гадзін дня.

6 гадзін сядзеў нерухома Сяргей Прытыцкі. Ён абдумваў кожную дэталь.

«Зал перапоўнен, — думаў ён.—Стрэльчук будзе даваць свае паказанні перад судом. Побач сядзяць падсудныя, адвакаты, журналісты. Страляць трэба так, каб нікога, акрамя правакатара, не забіць. І Прытыцкі рашае: падыйсці ўшчыльную к правакатару, рэвальверам правай рукі страляць знізу ўверх, у галаву прадажніка, другім рэвальверам, нахіленым некалькі ўніз—у плечы».

..«99 процантаў за тое, што я загіну. А так хочацца жыць. Як-жа выкарыстаць хоць малейшую магчымасць, каб выратавацца?» — працягваў думаць Прытыцкі.

Ён паглядзеў на ўваходныя дзверы. Яны зачынены. Абедзве паловы дзвярэй, як заўважыў Прытыцкі, былі не замацаваны ні знізу, ні зверху. Моцны штуршок—і яны расчыняцца. Прытыцкі маланкава перабірае ў памяці ўсе гэтыя думкі, узважваючы кожную дэталь. А Стрэльчук пачаў ужо гаварыць. Набліжаюцца рашучыя хвіліны.

Вось Стрэльчук гаворыць ужо адну, две, тры.. пяць мінут...

— Вось гэта банда, — хрыпіць правакатар, указваючы на падсудных...

У Прытыцкага пацямнела ў вачах. Ён бярэ сябе ў рукі — рашаючы момант наступіў.

— Хопіць! — рашае Прытыцкі...

Ён хутка ўстае, вымае абодва рэвальверы і ідзе па праходу наперад. На яго ніхто не звяртае ніякай увагі. Увесь зал прагавіта глядзіць наперад, слухаючы Стрэльчука. Дайшоўшы да сярэдзіны зала, Прытыцкі рыўком кідаецца наперад, б'е нагой дзверы бар'ера, падбягае ўшчыльную да Стрэльчука...

Усё гэта працягвалася толькі імгненне. Пракурор і члены суда, убачыўшы бегшага чалавека з рэвальверам у руках, хаваюцца пад стол. Стрэльчук не паспеў агледзецца, як раздаліся шэсць выстралаў. Здраднік паваліўся на пол. Прытыцкі пускае ў яго яшчэ дзве кулі...

У зале паніка. Усе кідаюцца к выхаду, але дзверы зачынены. Тут скопішча народу. Убачыўшы бягучага да натоўпу Прытыцкага, усе расступаюцца. Ён падбягае да дзвярэй, б'е ў іх плячом, і яны расчыняюцца. Прытыцкі выбягае на пляцоўку, дзе ўздоўж сцяны стаіць група паліцэйскіх. Яны ў жаху паднімаюць рукі ўгору і труслива крычаць:

— Даруй, пан, жыце!

Прытыцкі бяжыць па доўгай мрамарнай лесвіцы ўніз, але тут, апамятаўшыеся паліцэйскія адкрываюць па ім страляніну. Першая куля папала Прытыцкаму ў бок і, як потым выявілася, прастрэліла кішкі ў 19 месцах. Ногі падкасіліся, ён заваліўся на калені, затым кулем пакаціўся па лесвіцы ўніз.. Дасягнуўшы пляцоўкі, Прытыцкі бездапаможна распластаўся на ёй. Расхрабрыўшыеся паліцэйскія працягвалі страляць. Другая куля прастрэліла Прытыцкаму лёгкія, трэцяя зачапіла галаву і чацвертая папала ў руку. Адзін з рэвальвераў выпаў.

Адважны рэволюцыянер ляжаў у лужы крыві, а паліцэйскія і шпікі ўсё яшчэ працягвалі страляць..

Затым страляніна спынілася. Прыбеглі следчыя, пракурор. Жандармы навaліліся на грудзі сцякаючага крывёй падпольшчыка, прыціснулі ботам руку, стараючыся вырваць другі рэвальвер. Разарвалі пiджак, вопратку, робячы дасканалы вобыск.

— Хто ты?

Лічачы, што ён загіне, абяссілены Прытыцкі рашыў назваць сваё сапраўднае імя.

— Прытыцкі Сяргей!

Ён ляжаў на каменнай падлазе, адчуваючы ў жываце нясцерпную вострую боль. Здавалася, што ўнутры ў яго паліць гарачае жалеза. Адзервянела правая нага, мучыла смага.

— У каго ты страляў? — не адстваў ад яго следчы.

— У правакатара.

— Хто вынес яму смяротны прыгавор?

— Ён сам.

— Хто цябе паслаў?

— Ніхто. Я сам..

Праз паўтары гадзіны прыбыла карэта хуткай дапамогі. Але Сяргей Прытыцкі яшчэ жыў. Яго неслі да аўтамабіля хуткай дапамогі праз пляц, той самы пляц, на якім у 1863 годзе вешацель Мураўёў павесіў беларусаў-рэволюцыянераў, у тым ліку народнага героя Кастуся Каліноўскага.

Тут ужо сабраўся натоўп народа. Сабраўшы апошнія сілы, Прытыцкі прыпадняўся на насілках і, звяртаючыся да народа, закрычаў:

— Далоў польскіх паноў! Смерць правакатарам! Няхай жыве пролетарская рэволюцыя!

Паліцэйскія прыціснулі яго да насілак, і санітары хутка пабеглі да аўтамабіля.

У бальніцы Прытыцкага палажылі на аперацыйны стол. Урачы адмовіліся рабіць аперацыю, лічачы яе бескарыснай. Але было загадана аперыраваць.

Пякельная боль мучае яго. У мазгу праносяцца міражы. Успомнілася роднае сяло Гаркавічы і гара Стасюліха, якая велічна ўзвышалася над акругай, дзе прайшлі дзіцячыя годы Сяргея. І вось яму здаецца, што гара рухаецца на маленькага Сяргея, яна ўсім цяжарам навальваецца на яго, ён траціць свядомасць.

Прытыцкі выжыў. Настаў дзень, калі ён адчуў сябе лепш.

— Ах, вы прачнуліся, вы будзеце жыць, а мы так непакоіліся аб вашым лёсе, — пачуўся прытарна-салодкі голас шпіка, пераапранутага ў белы халат.

Потым пачаліся бясконцыя здзеклівыя допыты, якія працягваліся гадзінамі, знясіляючыя хворага з высокай тэмпературай.

— Прызнайся, або павесім!— пагражаў яму пракурор Вольскі.

Прытыцкага лячылі каб... павесіць. Праз месяц лячыць перасталі і адправілі ў турму. Буржуазны суд прыгаварыў рэволюцыянера да павешання. 10 месяцаў сядзіць Сяргей Прытыцкі ў камеры смяротнікаў, чакаючы кожную мінуту прывядзення прыгавара ў выкананне. Але на яго абарону паўстаў народ Заходняй Беларусі, народ усіх краін. У Амерыцы быў створан камітэт абароны Прытыцкага. Пад націскам народнага гнёву польскія ўлады замянілі Прытыцкаму смяротны прыгавор пажыццёвым зняволеннем.

Калі мы сядзім у будынку былога Беластоцкага ваяводства і гутарым з намеснікам старшыні аблвыканкома Сяргеем Прытыцкім, які ўсяго толькі пяць месяцаў таму назад вышаў з польскай катаржнай турмы, то нам не верыцца, што гэты, заўсёды ўсміхаючыйся чалавек, прайшоў такі цяжкі жыццёвы шлях.

Прытыцкі на працягу ўсяго свайго свядомага жыцця смела і нястомна змагаўся супроць польскіх прыгнятальнікаў, захапіўшых 20 год таму назад яго родную Заходнюю Беларусь. Чалавек выключнай смеласці і вялікай мужнасці, які перанёс за 27 год свайго жыцця многа лішэнняў, пакут, пытак, і як кожны рэволюцыянер, ён марыў аб светлай будучыні.

Ён палка верыў, што настане вялікі дзень вызвалення ад гнёту. Мара ажыццявілася.

Астатняе жыццё Прытыцкага прайшло на вачах у совецкага чытача. Сяргей Прытыцкі быў адным з актыўнейшых дэпутатаў гістарычнага Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. Ён быў членам Паўнамоцнай Камісіі, ён дакладваў 5-й Надзвычайнай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР у Маскве аб рашэннях народаў Заходняй Беларусі. Ён бачыў вялікага Сталіна.

Сяргей Прытыцкі сапраўдны сын працоўнага беларускага народа.

Галасуйце за Сяргея Прытыцкага — кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР!

І. ПАЎЛАЎ.

Аб ходзе работ дарожна-маставога будаўніцтва на аснове вопыту ферганскіх калгаснікаў

Пастанова абласнога выканаўчага камітэта і абкома КП(б)Б ад 16 лютага

Выкарыстоўваючы вопыт ферганскіх калгаснікаў у дарожна-маставым будаўніцтве, пры ўдзеле сялян з іх цягавай і рабочай сілай, у цэлым радзе вёсак нашай вобласці, як Златорыя, Фасты, Новае Александрава, Дабрынева, Летнікі, Копіск, Баршчова, Ізбішчы і інш., на працягу 30 дзён адноўлены 2 масты праз раку Супрасль, у 26 дзён — мост праз раку Нараў, і ўжо заканчваецца мост каля вёскі Жалткі.

Аблвыканком і абком разам з тым адзначаюць, што асобныя РВК і райкомы партыі (Беластоцкі, Парэцкі, Свіслацкі) недастаткова ўзначалілі масавы рух у будаўніцтве мастоў і дарог на тэрыторыі сваіх раёнаў, **пастанаўляюць:**

1. Адобрыць ініцыятыву і прапановы сялян вёскі Златорыя, Лапскага раёна, аб пабудове сваімі сіламі 4-х мастоў, а таксама сялян другіх вёсак у перабудове наступных пад'ездаў і дарог да прыстаней, чыгуначных станцый і шасейных магістралей: Яміна—Штабін, Сапоцкіна — Лойкі — Наумовічы, Заблудаў — Вялікае, Дабжынёва Бальшое—Дабжынёва Фабрычнае, Кнышын—Далестова, Аўгустоў — Бельск Бранск — Топчава, Цеханавец — Кучын, Люкава — Шэпетова, Валкавыск — Рось, Кватэры — Свіслач, Кабылін — Сокалы, Гібулічы — Квасоўка, Алекшыцы — Гудзевічы, Пажэчы — Азёры, Скідзель — Лунна, Руткі — чыгуначная ст. Чарнова, Ставіскі — Южэц — Едвабна, Коўнаты — Кабылін, Шэпанкова — Снядава, Сакаляны — Яноў, Багны — Дамураты, Шыманы — да шасе на Беласток — Граева і Шчучын — Ляхава, — усяго 166,5 кілометра дарог, у тым ліку 73 кілометры булыжнай мастаяой, 75,5 кілометра гравійнай і 18 кілометраў грунтова-палепшанай.

2. Абавязаць раённыя, партыйныя, савецкія, камсамольскія і дарожныя арганізацыі на месцах узначаліць і падтрымаць ініцыятыву сялян, рабочых заводаў, аказаўшы ім поўнае садзейнічанне і дапамогу ў будаўніцтве вышэйпералічаных дарог і мастоў.

3. Прапанаваць райвыканкомам, райкомам партыі, сельскім саветам і усім другім савецка-гаспадарчым арганізацыям неадкладна прыступіць да загатоўкі і падвозу на месцы неабходнай колькасці камення, гравія, пяску, лесаматэрыялаў для пабудовы дарог, выкарастаўшы поўнасцю санны шлях для гэтай мэты.

4. Прапанаваць начальніку абладараддзела тав. Мордасу на працягу 2-х дзён давесці да кожнага раёна план загатоўкі і вывазкі дарожна-будаўнічых матэрыялаў на другую палову лютага і сакавіка месяца 1940 года.

5. Прапанаваць раённым партыйным, камсамольскім і савецкім арганізацыям абмеркаваць на сходах пытанне дарожнага будаўніцтва, наметціўшы канкрэтныя мерапрыемствы па ўдзелу і кіраўніцтве партыйных, савецкіх і камсамольскіх арганізацый у будаўніцтве мастоў і дарог.

6. Для арганізацыі дарожных работ, праводзімых па ініцыятыве шырокіх мас, арганізаваць абласную камісію садзейнічання ў дарожным будаўніцтве ў саставе: 1) Касцюк, сакратар Беластоцкага абкома КП(б)Б — старшыня, і членаў: 2) Прытыцкі — нам. старшыні Беластоцкага аблвыканкома, 3) Печурэнка — сакратар абкома ЛКСМБ, 4) Зельманаў — адказны рэдактар газеты „Вольная праца", 5) Гелер — загадчык транспартным аддзелам абкома КП(б)Б і 6) Мордас — начальнік абладараддзела.

7. Ускласці адказнасць за арганізацыю і своечасовае правядзенне работ па будаўніцтву дарог і мастоў у раёнах на сакратароў РК КП(б)Б, старшынь райвыканкомаў, а па тэхнічнаму кіраўніцтву — на начальнікаў райдораддзелаў.

8. Прапанаваць райкомам і райвыканкомам арганізаваць у раёнах і сельсаветах камісіі па садзейнічанню ў хуткім дарожным будаўніцтве.

9. Прапанаваць аблздраву тав. Лебедзеву забяспечыць медабслугоўванне насельніцтва, занятага ў дарожным будаўніцтве.

10. Прапанаваць аблторгаддзелу і аблхарчсаюзу арганізаваць для ўдзельнікаў у будаўніцтве дарог адпаведнае харчаванне, а таксама гандаль у месцах скораснага будаўніцтва.

11. Абавязаць абласное Упраўленне на справах мастацтваў т. Элье і абласное Упраўленне па кінофікацыі забяспечыць культурнае абслугоўванне ўдзельнікаў, занятых на скорасным дарожным будаўніцтве.

12. Прапанаваць рэдактарам раённых газет шырока і сістэматычна асвятляць у друку ход будаўніцтва дарог і мастоў і мабілізацыю сялянскіх мас на актыўны ўдзел іх у гэтай найважнейшай дзяржаўнай справе.

Старшыня Беластоцкага аблвыканкома
МАЛЬЦАЎ
Сакратар Беластоцкага абкома КП(б)Б
КАСЦЮК



На здымку: тав. Барэйша Пётр, які працуе канторшчыкам на ст. Беласток, малюе агітацыйныя плакаты да дня выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. (Фото Сапір).

АГІТАТАР ДЗІМІТРЫЙ НІКІЦЮК

Зараз у Беластоку на выбарчых участках па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР працуе каля 2000 агітатараў. У большасці гэта рабочыя і работніцы мясцовых фабрык і заводаў, служачыя і інтэлігенцыя ўстаноў і прадпрыемстваў. Многія ўжо маюць вопыт агітацыйнай работы. Яны набылі яго ў час выбараў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі. Да такіх адносіцца і Дзімітрый Бенедзіктавіч Нікіцюк.

Днём Дзімітрый Бенедзіктавіч працуе ў паравозным дэпо станцыі Беласток. Не гледзячы на свой 62-гадовы ўзрост ён не хоча ісці на пенсію.

— Толькі зараз і папрацаваць на сваю родную, савецкую ўладу, — радасна ўсміхаючыся, гаворыць Дзімітрый Бенедзіктавіч. — Я шчаслівы іменна тым, што працую...

Вечарам тав. Нікіцюк ідзе на свой 31 выбарчы ўчастак Чыгуначнай выбарчай акругі. З 6 дамоў рабочыя, работніцы, хатнія гаспадыні, моладзь вельмі ахвотна ідуць паслухаць старога Нікіцюка.

Растлумачваючы Палажэнне аб выбарах або Сталінскую Канстытуцыю, тав. Нікіцюк умела выкарыстоўвае мясцовы матэрыял. Канкрэтнымі прыкладамі з асабістага жыцця, жыцця суседзяў ці працоўных гор. Беластока ён наглядна паказвае ўвесь жах беспрасветнага жыцця ў былой польскай дзяржаве.

— Я паляк, — гаварыць слесар Крашэўскі, — але я ніколі не чытаў польскай канстытуцыі. Чаму? Таму што ўсё напісанае ў ёй — хлусня. Урад баяўся распаўсюджваць канстытуцыю ў масах іменна таму, што ў ёй не было праўды. Таму канстытуцыю хавалі далей ад народа.

— Цяпер глядзіце, — перапыняе Крашэўскага Нікіцюк, — глядзіце, як праўдзіва кожнае слова Сталінскай Канстытуцыі. У Савецкім Саюзе ўсё належыць народу. І ў нас, у заходніх абласцях Беларусі, цяпер усё належыць народу. Заводы і фабрыкі нашы. Па адной толькі Беластоцкай вобласці больш 300 прыватных прадпрыемстваў сталі дзяржаўнымі. Зямля таксама наша. У вобласці было 613 памешчыкаў, яны мелі 180.000 гектараў зямлі. Гэту зямлю раздалі сялянам. 8300 сялянскіх гаспадарак зусім не мелі зямлі. Савецкая ўлада дала ім 83.000 гектараў, 2900 коней, 5400 кароў, многа свіней і авец.

— А вазьміце беспрацоўе. У Беластоку была маса беспрацоўных. За час існавання савецкай улады 12.200 чалавек атрымалі пастаянную работу. У Савецкім Саюзе не ведаюць, што такое беспрацоўе. Скора і мы не будзем ведаць гэтага.

Так на канкрэтных прыкладах Дзімітрый Бенедзіктавіч Нікіцюк агітуе за перамогу сталінскага блока камуністаў і беспартыйных у прадстаячых выбарах.

Бываюць дні, калі непрыкметна гутарка зацягваецца за поўнач. Тады Дзімітрый Бенедзіктавіч, як-бы спахваціўшыся, гаворыць:

— Старая дома чакае. Вячэра, нябось, застыла. Збярэмся заўтра, таварышы.

Г. Красаўцаў.

Чырвоная Армія не мела і не будзе мець паражэнняў

(На ўрачыстым сходзе ў гортэатры)

Вечарам 22 лютага ў Беластоцкім гарадскім тэатры сабраліся рабочыя і работніцы, інтэлігенты, прадстаўнікі савецкіх і грамадскіх арганізацый, прадстаўнікі вайсковых часцей. Многія з прысутных упершыню свабодна і радасна святкуюць XXII гадавіну сваёй вызваліцельніцы, слаўнай і непераможнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Чырвонага Ваенна-Марскога Флота.

На сцэне — вялікі партрэт Леніна і Сталіна, бюст пралетарскага палкаводца Клімента Ефрэмавіча Варашылава.

Урачысты сход адкрывае старшыня горвыканкома тав. Сенкевіч. У прэзідыум выбіраецца 33 чалавекі, у тым ліку кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР — сакратары абкома КП(б)Б тт. Ігаеў і Касцюк, тт. Прытыцкі, Дз'ячук, Вайцэшук, Машэвіцкі і інш.

Апладысментамі сустракае зал прапанову абраць ганаровы прэзідыум. Стоячы, прысутныя ў адзіным парыве выбіраюць у ганаровы прэзідыум правадыра народаў таварыша Сталіна і яго баявых саратнікаў, членаў Палітбюро ЦК ВКП(б), а таксама таварышоў Дзімітрава і Тэльмана.

Слова для даклада „XXII гадавіна Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Чырвонага Ваенна-Марскога Флота" атрымлівае тав. Чэрнікаў.

— Чырвоная Армія, — гаворыць дакладчык, — з'яўляецца самай маладой і адзінай у свеце арміяй па тых палітычных задачах, якія пастаўлены перад ёю.

Тав. Чэрнікаў падрабязна расказвае гісторыю стварэння ўзброеных сіл соцыялістычнай рэспублікі, падкрэслівае выключную ролю ў гэтым камуністычнай партыі і асабіста вялікіх правадыроў Леніна і Сталіна. Дакладчык расказвае аб годах грамадзянскай вайны, калі маладая савецкая рэспубліка адбівалася ад 14 краін — імперыялістычных драпежнікаў, акружыўшых яе вогненным кальцом, спынялася на ўсіх трох паходах Антанты супроць нашай радзімы

— Таварыш Сталін, як найвялікшы стратэг і палкаводзец, — гаворыць дакладчык, — пасылаўся партыяй на найбольш цяжкія, небяспечныя франты, і ўсюды, дзе паяўляўся таварыш Сталін, — была забяспечана перамога. Дакладчык гаворыць аб ролі ў грамадзянскай вайне пролетарскіх палкаводцаў Варашылава, Будзённага, Куліка, Шчадэнка і інш.

Тав. Чэрнікаў гаворыць аб магутнасці, несакрушальнай сіле нашай арміі, з якой яна сустракае свой 22-гадовы юбілей. Ён гаворыць аб доблесці нашых сталінскіх сокалаў, аб магутнасці варашылаўскіх залпаў нашай артылерыі і стралковых корпусаў, аб танках, доблесных пехацінцах, аб асобым родзе зброі, якога няма ні ў адной капіталістычнай арміі, — аб нашых камісарах і палітработніках, якія вядуць байцоў у атаку пад воклічы: „За радзіму, за Сталіна, наперад!".

— Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія пакрыла сябе неўміручай славай у годы грамадзянскай вайны, ля возера Хасан, ля Халхін-Гола, пры вызваленні народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Яна пакрывае сябе доблесцю і геройствам зараз у барацьбе з белафінскімі бандытамі.

Наша Армія не мела і не будзе мець паражэнняў таму, што ёй кіравалі такія геніі чалавецтва, як Ленін і Сталін, таму, што ёй кіруе камуністычная партыя і вялікі правадыр таварыш Сталін, таму, што яна выхавала такіх таленавітых пролетарскіх палкаводцаў, як Варашылаў, Будзённы, Шчадэнка і многія другія, таму, што наша армія мае моцную эканамічную базу, таму, што мы маем выдатныя кадры.

Дакладчык скончыў. З усіх канцоў зала нясуцца прывітальныя воклічы ў чэсць непераможнай Чырвонай Арміі, у чэсць яе палкаводца Варашылава, у чэсць любімага правадыра народаў таварыша Сталіна.

У аднадушным парыве прысутныя прымаюць тэксты прывітальных пісем любімаму Сталіну, главе савецкага ўрада таварышу Молатаву, першаму маршалу Савецкага Саюза таварышу Варашылаву.

* * *

Пасля ўрачыстай часткі сіламі 2-га Беларускага Дзяржаўнага тэатра была пастаўлена вядомая п'еса Пагодзіна „Чалавек з ружжом".

Т. Лясовіч

Вялікая школа

Да Чырвонай Арміі я працаваў трактарыстам Гайсінскай МТС, Вінніцкай вобласці. Трактарыст я быў нядрэнны, але больш нічога не ведаў, бо быў малапісьменным. Бывала парушае калгаснік статут, а я і растлумачыць шкоднасць гэтага як след не ўмею.

Але вось настаў дзень майго прызыва. Гэты дзень быў для мяне і для маіх родных вялікім святам. Калгас наладзіў вечарынку, іграла музыка. Я абяцаў калгаснікам служыць чэсна.

У часці я папаў у школу малодшых камандзіраў. Цяжка было вучыцца (перашкаджала мая малапісьменнасць), але паступова я авалодаў ведамі.

Па сканчэнні школы мне прысвоілі званне малодшага камандзіра і назначылі механікам вадзіцелем баявой машыны. Як свой трактар „Сталінец", які дапамог мне стаць танкістам, я палюбіў і свой танк. Заўсёды трымаю яго ў баявой гатоўнасці, памятаючы словы таварыша Сталіна аб тым, што мы знаходзімся ў капіталістычным акружэнні.

Уступіў я ў комсамол. Працую ў гуртках, прымаю ўдзел у масавай рабоце, стаў разбірацца ў палітычных пытаннях.

Цяпер я — кандыдат у члены ВКП(б). Вывучаю гісторыю партыі, чытаю творы Леніна і Сталіна. 23 лютага мінулага года я даў ваенную прысягу. Гэту свяшчэнную клятву нашу ў сваім сэрцы.

Праслужыўшы 28 месяцаў, я не маю ніводнай заўвагі. За выдатнае ваджэнне танка і за выдатную баявую і палітычную падрыхтоўку атрымаў падзяку ад камандавання і грашовую прэмію. Я падрыхтаваў 12 танкістаў. Аддаў ім увесь свой вопыт і ўпэўнен, што яны будуць нядрэннымі танкістамі.

М. Мельнік.



НА БУДАЎНІЦТВЕ ДНЕПРА-БУГСКАГА КАНАЛА

Тэмпы будаўніцтва вялікага Днепра-Бугскага канала штодзень павялічваюцца. Увесь шматтысячны калектыў рабочых, занятых на будаўніцтве канала, жыве адзінай марай — выканаць у тэрмін заданне партыі і ўрада, да першай савецкай навігацыі стварыць на тэрыторыі заходніх абласцей БССР новы водны шлях.

Авангардная роля ў ажыццяўленні гэтай пачотнай і адказнай задачы належыць партыйна - камсамольскаму ядру рабочых. Члены нашай слаўнай ленінска-сталінскай партыі і яе надзейнага памочніка камсамола, не раз браўшыя любыя крэпасці, і зараз, на будаўніцтве канала, ва ўмовах халоднай зімы, паказваюць прыклады самаадданай большэвіцкай работы. Яны арганізуюць і натхняюць усіх будаўнікоў канала на нябачаныя подвігі, на барацьбу за соцыялістычныя метады працы.

Многія члены партыі і камсамола ўпершыню на канале сустрэліся з гідрабудаўнічымі работамі. Аднак за кароткі час яны авалодалі працэсамі вытворчасці, складанай тэхнікай машын і цяпер з'яўляюцца здольнымі і вопытнымі кіраўнікамі. Так, напрыклад, член партыі тав. Фуфаеў вылучан на пасаду начальніка будаўнічага ўчастка № 10. Яго ўчастак увесь час трымае пяршынства па выкананню плана будаўнічых работ. Ужо зараз на ўчастку закончаны катлаваны пад галавы шлюзаў. Хутка поўнасцю будуць забіты палі плацін. На ўчастку шырока разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва паміж брыгадамі. Ёсць чатыры ініцыятыўныя камсамольска-маладзёжныя брыгады. Брыгада камсамольца тав. Жэлудкова штодзённа выконвае нормы выпрацоўкі на земляных работах больш, чым на 200 процантаў. Другая брыгада — тав. Прыхоцькі — выконвае планавае заданне на 180 процантаў.

У інтэрнатах рабочых участка культурна і весела. Устаноўлены радыёпрыёмнікі, на сталах заўсёды ёсць газеты, журналы, набыты музыкальныя інструменты.

У брыгадах арганізаван выпуск насценных газет, у якіх асвятляецца жыццё брыгады, паказваюцца яе перадавыя людзі, вытворчыя рэкорды асобных рабочых.

Член партыі тав. Грыбянькоў самастойна кіруе ўчасткам № 4. На працягу некалькіх дзесяткаў кіламетраў участка паспяхова праводзяцца ўсе работы. Усюды адчуваецца перадавая роля камсамольцаў. Брыгада тав. Іспянькова А. норму выпрацоўкі выконвае на 197 процантаў. Славяцца на ўчастку сваім працоўным гераізмам маладыя рабочыя тт. Макарчук Ігнат, Цяральчук Іван, брыгадзір тав. Караленка П. 175 процантаў — такія іх штодзённыя паказальнікі выпрацоўкі на канале.

Па ініцыятыве сялян трох вёсак — Булькава, Пшанаі і Салейко, Жабінскага раёна, у чэсць XXII гадавіны Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота ў раёне аб'яўлен дэкаднік дапамогі Днепра-Бугскаму будаўніцтву. Так, з вёскі Ракітніца 12 лютага на суботнік з'явілася больш 110 чалавек, у тым ліку 30 сялян з падводамі.

Побач з камсамольска-маладзёжнымі брыгадамі на ўчастку арганізаваны чатыры брыгады з мясцовага насельніцтва. Брыгада селяніна вёскі Радавічы 51-гадовага тав. Дземютрука выконвае норму на 150 процантаў пры мёрзлым грунце. Былы батрак маёнтка Новасады тав. Падалеўскі стаў знатным чалавекам не толькі ўчастка № 9, але і ўсяго канала, ён выконвае нормы земляных работ на 265 процантаў. Лепшыя рабочыя тт. Мірошнік П. і Дзягель за датэрміновае выкананне плана адміністрацыяй участка прэміраваны.

Гіганцкія рыштаванні высяцца на гідравузле № 5. Тут графік будаўнічых работ не ведае хістанняў. Камсамольская брыгада тав. Фіткевіча сістэматычна выконвае свой план не менш, як на 160—180 процантаў. На гідравузле паспяхова праводзіцца заключэнне дагавораў з рабочымі на заканчэнне ўсіх работ. За некалькі дзён заключана каля 500 дагавораў з найбольш кваліфікаванымі рабочымі.

Разам з будаўніцтвам растуць новыя кадры рабочых. Сяляне вёскі Зарэчка, Драгічынскага раёна, А. Воранаў, Р. Камінскі, А. Матузко прышлі на будаўніцтва з першых дзён разгортвання работ. Зараз яны не толькі самі паказваюць лепшыя ўзоры працы, але і арганізуюць работу сярод насельніцтва. Раней яны былі дапаможнымі рабочымі, а цяпер вылучаны брыгадзірамі-закапёршчыкамі.

Вялікую дапамогу ў будаўніцтве канала аказваюць Брэсцкі і Пінскі абкомы КП(б)Б, Драгічынскі, Жабінскі, Іванаўскі і Кобрынскі райкомы партыі, Брэсцкі гарком КП(б)Б.

У сувязі з надыходам усенароднага свята — дня выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР — члены партыі і камсамольцы ўзначальваюць усю агітацыйна-масавую работу. З асяроддзя камсамольцаў падрыхтавана 100 агітатараў, якія праводзяць заняткі ў рабочых гуртках па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Бесперапынна расце палітычная свядомасць і актыўнасць рабочых. 75 чалавек працуюць старшынямі, сакратарамі і членамі ўчастковых выбарчых камісій. Многія рабочыя пачалі самастойна вывучаць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», творы класікаў марксізма-ленінізма.

Вясной 1940 года савецкія судны пройдуць па новаму руслу вялікага Днепра-Бугскага канала — заданне большэвіцкай партыі і нашага ўрада будзе выканана ў тэрмін.

А. СОРКІН,
парторг ЦК КП(б)Б па Днепра-Бугскаму будаўніцтву.

ТЭЛЕГРАМЫ

ГЕРМАНА-НАРВЕЖСКІЯ ГАНДЛЁВЫЯ ПЕРАГАВОРЫ

Осло, 23 лютага. (ТАСС). Як перадае нарвежскае тэлеграфнае агенцтва, паміж Нарвегіяй і Германіяй дасягнута гандлёвае пагадненне. Як чакаюць, гэта пагадненне будзе падпісана ў бліжэйшы час і заўтра будзе зроблена афіцыяльная заява па гэтаму поваду.

—о—

АНГЛІЙСКІ АДКАЗ НА АМЕРЫКАНСКУЮ НОТУ ПРАТЭСТУ

Нью-Йорк, 23 лютага. (ТАСС). Як паведамляе лонданскі карэспандэнт газеты «Нью-Йорк таймс», англійскі ўрад паслаў у ЗША ноту, у якой ён адмаўляе амерыканскі пратэст у сувязі з захватам англічанамі германскага экспарта.

—о—

ЗВАРОТ «НАЦЫЯНАЛЬНАГА НЕГРЫЦЯНСКАГА КАНГРЭСА»

Нью-Йорк, 22 лютага. (ТАСС) Як перадае газета «Дэйлі уоркер», кіраўніцтва «Нацыянальнага негрыцянскага кангрэса» (масавая арганізацыя неграў у ЗША) апублікавала зварот, у якім гаворыцца, што 26 красавіка склікаецца 3-ці агульнаамерыканскі з'езд гэтай арганізацыі. У звароце падкрэсліваецца, што цяперашняе становішча патрабуе адзінства негрыцянскага народа, а таксама ўсіх прыхільнікаў раўнапраўя неграў, пражываючых у ЗША. 125 тысяч неграў ужо звалены з грамадскіх работ у сувязі з скарачэннем асігнаванняў на дапамогу беспрацоўным. Дзесяткі тысяч неграў знаходзяцца пад пагрозай звальнення. Рэакцыйныя сенатары, гаворыцца ў звароце, пагражаюць праваліць законапраект супроць лінчавання неграў. Рэакцыйныя элементы ўжо замахваюцца на сацыяльнае заканадаўства і спрабуюць уцягнуць амерыканскі народ у вайну. Рэакцыянеры выкарыстоўваюць пагрозу вайны ў якасці шырмы для таго, каб утаіць наступленне на дэмакратычныя правы і на жыццёвыя ўмовы працоўных.

АБВЯРЖЭННЕ ТАСС

1. Агенцтва Рэйтэр распаўсюджвае паведамленне свайго стакгольмскага карэспандэнта, быццам «сем савецкіх самалётаў скінулі 10 фугасных і вялікую колькасць запальных бомб на шведскую вёску Паяла, размешчаную ў 5 мілях ад фінскай пагранічнай шасейнай дарогі».

ТАСС упаўнаважан заявіць, што ні адзін савецкі самалёт не лятаў над вёскай Паяла і наогул над шведскай тэрыторыяй, а паведамленне агенцтва Рэйтэр у адносінах савецкіх самалётаў з'яўляецца злосным вымыслам.

2. Французскае агенцтва Гавас, некаторыя французскія і англійскія, а таксама і асобныя германскія газеты распаўсюджваюць чуткі аб тым, што Савецкі Саюз прад'явіў патрабаванні да Эстоніі, Латвіі і Літвы аб прадастаўленні СССР новых марскіх баз, аб павелічэнні колькасці «ваенных баз» і г. д.

ТАСС упаўнаважан заявіць, што ўсе гэтыя паведамленні ні на чым не аснованы і з'яўляюцца поўнасцю вымыслам.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АНАТАЛІЙСКАГА АГЕНЦТВА

Анкара, 22 лютага. Анаталійскае агенцтва друкуе абвяржэнне ТАСС, змешчанае ў савецкім друку 20-га лютага ў сувязі з хлуслівым паведамленнем, распаўсюджаным агенцтвам Стэфані, нібы савецкі атрад перайшоў граніцу на Каўказе.

Змяшчаючы гэтае абвяржэнне ТАСС, агенцтва снабжае яго наступнай заўвагай: „Анаталійскае агенцтва паведамляе, што анкарскія кругі таксама далучаюцца да гэтага абвяржэння ТАСС".

(ТАСС).

Латвійскі друк аб XXII гадавіне Чырвонай Арміі

Рыга, 23 лютага. (ТАСС). Сёння ўвесь латвійскі друк шырока адзначае XXII гадавіну Чырвонай Арміі. Газеты друкуюць партрэты таварышоў Сталіна і Варашылава.

Газета «Латвіас карэйвіс» у артыкуле, прысвечаным гадавіне Чырвонай Арміі, піша: «Мы цвёрда ўпэўнены ў тым, што пакты аб узаемадапамозе, заключаныя паміж Латвіяй і Савецкім Саюзам, і у далейшым будуць асновай супрацоўніцтва і ўзаемнага давер'я паміж гэтымі дзяржавамі. Жадаем свайму вялікаму суседу і яго Арміі самых лепшых поспехаў.»

ПРАСЛЕДВАННЕ ПРОФСАЮЗНЫХ КІРАЎНІКОЎ У ЗША

Нью-Йорк, 23 лютага Як паведамляе газета «Дэйлі уоркер», у Нью-Йорку пачаўся суд над 26 кіраўнікамі профсаюза рабочых прадпрыемстваў (профсаюз уваходзіць у Кангрэс вытворчых профсаюзаў). Яны абвінавачваюцца ў парушэнні ў 1933 г. закона супроць буйных манаполій.

Газета адзначае, што пракурор імкнецца паставіць знак роўнасці паміж кіраўнікамі прагрэсіўнага профсаюза і гангстэрамі, якія раней тэрарызавалі футравую прамысловасць. Газета падкрэслівае, што суд над кіраўнікамі гэтага профсаюза з'яўляецца часткай агульнай кампаніі, пачатай міністэрствам юстыцыі супроць профсаюзаў.

Па паведамленню агенцтва Асашыэйтэд Прэс з Вашынгтона міністэрства юстыцыі ЗША перадала суду 106 кіруючых работнікаў профсаюза будаўнікоў. Усе яны таксама абвінавачваюцца ў парушэнні закона супроць буйных манаполій. Агенцтва ўказвае, што ў Піттсбургу (штат Пенсільванія) ужо асуджана група членаў профсаюза электрыкаў, уваходзячых у Амерыканскую федэрацыю працы.

Пасля пачатку вайны амерыканскія ўлады перадалі суду вялікую колькасць кіраўнікоў профсаюзаў, абвінаваціўшы іх у тым, што яны вымушалі прымаць на работу адпаведныя групы членаў профсаюзаў.

(ТАСС)

ГЕНЕРАЛ БАЙ-ЦЗУН-СІ АБ ПЕРСПЕКТЫВАХ ВАЙНЫ Ў КІТАІ

Чунцын, 23 лютага. (ТАСС). Агенцтва Сентрал ньюс друкуе заяву генерала Бай-Цзун-сі, у якой ён выражае ўпэўненасць у канчатковай перамозе Кітая. Японія, заявіў Бай-Цзун-сі, мабілізавала 50 дывізій з магчымых 80. Каля 46 японскіх дывізій знаходзяцца ў Кітаі і амаль усе яны папаўняліся каля 30 раз. Японія ўжо выдаткавала на вайну з Кітаем звыш 20 мільярдаў іен. Унутраная запазычанасць Японіі з кожным днём павялічваецца. Эканамічныя магчымасці Японіі не дазваляюць ёй весці працяглую вайну. Рашучасць Кітая прадаўжаць узброенае супраціўленне ўзрастае.

—о—

НА СЕСІІ ЯПОНСКАГА ПАРЛАМЕНТА

Токіо, 23 лютага. (ТАСС). Японскія газеты паведамляюць, што сёння ў выступленнях на пленарным пасяджэнні верхняй палаты японскага парламента было выражана нездавальненне ўрадам. (Нездавальненне гэта выклікана тым, што ў час закрытага пасяджэння ніжняй палаты 15 лютага ўрад, зрабіўшы даклад па пытаннях аб вырашэнні кітайскіх падзей, адмовіўся адказваць на пытанні дэпутатаў). У сувязі з гэтым выступіў прафесар Івата, які заявіў: «Урад адмовіўся адказваць на пытанні дэпутатаў, нарушыўшы парламенцкія звычаі, якія дзейнічалі на працягу 50 год. Такім чынам, урад зрабіў немагчымым задаваць пытанні». «Ці думае ўрад,—запытаў Івата,— у далейшым адмаўляцца адказваць на пытанні?. Калі ўрад будзе адмаўляцца адказваць на пытанні, тады і абмеркаванне бюджэта будзе надзвычайна цяжкім. На пытанне Івата, прэм'ер міністр Іонай адказаў, што ўрад такіх намераў не мае і будзе рыхтавацца да адказаў.

—о—

ГАНЕННІ НА КОМУНІСТАЎ ВА ФРАНЦЫІ

Парыж, 23 лютага. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Гавас, прэзідэнт французскай рэспублікі Лебрэн падпісаў новы дэкрэт аб звальненні 61 саветніка-камуніста, занімаўшых пасты ў дванаццаці розных дэпартаментах.



Малады ткач 1-га тэкстыльнага камбіната ў г. Беластоку тав. Медлінскі першы перайшоў на абслугоўванне двух станкоў.

На здымку: дырэктар камбіната т. Вальфсон вітае стаханаўца-ткача Медлінскага з паспехамі ў яго рабоце. (Фота-хроніка БЕЛТА).

Тэкстыльшчыкі Беластока ў гасцях у трохгорцаў

Масква. (Карэспандэнт газ „Советская Белоруссия"). Па цэхах „Трохгоркі" пракацілася радасная вестка.

— Да нас прыехалі госці. Яны раскажуць, як тэкстыльшчыкі Беластока выконваюць свае абавязацельствы ў сацыялістычным спаборніцтве з трохгорцамі.

Вечарам у вялікім зале пасяджэнняў парткома было поўна людзей. Прышлі гаспадарнікі, партыйны і камсамольскі актыў.

Паяўленне беластачан выклікае радасць у зале. Асабліва дружна прымаюць гасцей трохгорцы, якія ведаюць іх па Беластоку. Слова атрымлівае дырэктар тэкстыльнага камбіната Беластока тав. Вальфсон.

— Па прыкладу сваіх шэфаў трохгорцаў, — гаворыць ён,— беластоцкія тэкстыльшчыкі становяцца многастаночнікамі. Упершыню ў гісторыі Беластока ткачы пераходзяць ад абслугоўвання аднаго да 2-х і нават 4-х станкоў. Вось чаму няма ніякага сумнення, што квартальны план у 335 тысяч метраў шарсцяных тканін камбінат выканае датэрмінова, да дня выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР — 24 сакавіка.

Беластоцкія тэкстыльшчыкі свае абавязацельствы выконваюць. Палепшана вытворчая работа. Абсталёўваюцца сталоўкі. Арганізаваны яслі. На камбінаце выходзяць насценныя газеты, адкрыты чырвоныя куткі, створаны гурткі па вывучэнню Канстытуцыі і выбарчага закона, ідзе ўзмоцненая падрыхтоўка да выбараў.

Беластоцкіх тэкстыльшчыкаў вітала ад імені калектыва трохгорцаў сакратар партыйнага камітэта партыі тав. Саламаціна.

Л. Сасонкін.

Адказны рэдактар **Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.**

ПОСТАНОВЛЕНИЕ № 125

областного исполнительного комитета

16 февраля 1940 г. г. Белосток

о введении государственного социального страхования в Белостокской области (доклад тов. Кац).

В соответствии с постановлением СНК СССР, ЦК ВКП(б) от 29.1.1940 г. и секретариата ВЦСПС от 1 февраля 1940 г. о введении государственного социального страхования в западных областях УССР и БССР, Белостокский Облисполком **постановляет:**

1. Обязать все государственные, общественные, кооперативные, частные предприятия, учреждения и хозяйства, имеющие наемных рабочих и служащих, зарегистрироваться в качестве страхователей в соответствующих профессиональных союзах,

2. С 1 января 1940 г. все указанные в первом пункте предприятия, учреждения и хозяйства должны начислить взносы на государственное социальное страхование по установленным страховым тарифам для соответствующих профессиональных союзов.

а) внести начисленные с 1 января с. г. страховые взносы на текущие счета профессиональных союзов по государственному, социальному страхованию,

б) дальнейшие платежи по социальному страхованию производить строго в установленные правилами сроки.

3. Производить выплату пособий по государственному социальному страхованию рабочим и служащим согласно решениям профсоюзных организаций в соответствии с действующим законодательством.

4. Обязать Оргбюро профсоюзов по Белостокской области дать всем организациям и предприятиям соответствующие указания о порядке начисления социального страхования.

Председатель Облисполкома **МАЛЬЦЕВ.**
Секретарь **ЕГОРОВ.**

К СВЕДЕНИЮ ГРАЖДАН г. БЕЛОСТОКА.

С 19-го февраля с. г. по ул. КРАСНОАРМЕЙСКОЙ № 1

ОТКРЫТА ГОСУДАРСТВЕННАЯ ТРУДОВАЯ СБЕРЕГАТЕЛЬНАЯ КАССА № 6409

СБЕРКАССА производит прием и выдачу вкладов до востребования и срочных.

СБЕРКАССА уплачивает гражданам по вкладам до востребования 3% годовых и по срочным вкладам—5% годовых.

О производстве других операций будет об'явлено особо.

СБЕРКАССА открыта для операций с 10 ч. утра до 16 час. (моск. вр.).

Целость вкладов внесенных в сберегательные кассы **гарантируется правительством Союза ССР.**

Сберегательные кассы строго соблюдают тайну вкладов.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнога рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абпліта № 203. 1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.